Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
Дзяржаўная ўстанова дадатковай адукацыі
"Докшыцкі раённы цэнтр
дзяцей і моладзі"
211720, Віцебская вобласць,
г. Докшыцы, вул. Ленінская, д. 5
тэл. 2-69-90
Ад 18.12.2025 № 404
На № ад

Інфармацыя аб выніках
раённага этапу V Рэспубліканскага
фестывалю-конкурсу праектаў
"Нашчадкі традыцый"

З мэтай патрыятычнага і духоўна-маральнага выхавання навучэнцаў праз іх далучэнне да каштоўнасцей беларускай культурнай спадчыны, вывучэння рэгіянальных народных традыцый і развіцця дзіцячай творчасці ў галіне беларускага народнага мастацтва ў перыяд са жніўня па снежань 2025 года прайшоў раённы этап V Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў "Нашчадкі традыцый".

На раённы этап рэспубліканскага фестывалю-конкурсу было прадстаўлена 5 матэрыялаў з устаноў агульнай сярэдняй адукацыі: "Бягомльская сярэдняя школа імя С.С.Манковіча", "Сярэдняя школа №1 г.Докшыцы імя І.С.Палявога", "Глінская сярэдняя школа", "Параф'янаўская сярэдняя школа", і ДУДА "Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі". Конкурс праходзіў у дзвюх узроставых катэгорыях: 10–13 гадоў і 14–18 гадоў па трох намінацыях: "Культурныя традыцыі і абрады роднага краю", "Музычная спадчына маёй Радзімы", "Рукатворныя помнікі народнага мастацтва маёй краіны" .

У намінцыі "Культурныя традыцыі і абрады роднага краю" было заяўлена 4 работы, "Рукатворныя помнікі народнага мастацтва маёй краіны" – 1. У намінацыі "Музычная спадчына маёй Радзімы" матэрыялы адсутнічалі.

Дадзеныя работы прадстаўлялі сабой даследніцка-творчыя праекты ў галіне народных абрадаў і свят, дэкаратыўна-прыкладной творчасці, беларускай батлейкі, якія былі накіраваны на даследванне і мастацкую рэканструкцыю элементаў традыцыйнай культурнай спадчыны Докшыцкага раёна.

Работы навучэнцаў з ДУА "Глінская сярэдняя школа" і ДУДА "Докшыцкі РЦДзіМ" адрозніваліся паўнатой і інфармацыйнасцю даследвання выбранай тэмы, творчым падыходам. Этапы рэалізацыі праектаў падтрымліваліся вялікай колькасцю фота і відэаматэрыялаў з удзелам навучэнцаў. Выкананы ўсе патрабаванні да конкурсу.

Цікавыя звесткі з гісторыі народнай спадчыны Докшыччыны былі адлюстраваны ў работах навучэнцаў устаноў адукацыі "Бягомльская

сярэдняя школа імя С.С.Манковіча” і “Сярэдняя школа №1 г.Докшыцы імя І.С.Палявога”.

На жаль, не ўсе работы адпавядалі патрабаванням і ўмовам конкурсу: у адным з праектаў не было відэароліка з дэманстрацыяй вопыту і вынікаў праектнай дзейнасці; не ўсе прадстаўленыя тэксты праектаў былі выверaны (шмат маўленчых памылак).

Разгледзеўшы і прааналізаваўшы конкурсныя матэрыялы, журы вырашыла:

1. Прызнаць пераможцамі і прызёрамі раённага этапу рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў “Нашчадкі традыцый”:

**I месца** – Вараб’ёва Аляксандра, Найдзенка Соф’я, навучэнкі ДУА “Глінская сярэдняя школа”, кіраўнік Самсановіч А. І.;
**I месца** – Бадун Дзіяна, Машкевіч Дар’я, навучэнкі аб’яднанняў па інтарэсах ДУДА “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”, кіраўнік Савулава В.П.;
**II месца** – Палонік Мікіта, навучэнец ДУА “Бягомльская сярэдняя школа імя С.С.Манковіча”, кіраўнік Сідаронак А.М.;
**III месца** – Місачэнка Еўфрасіння, Ціхановіч Ксенія, навучэнкі ДУА “Сярэдняя школа №1 г. Докшыцы імя І.С.Палявога”, кіраўнік Зайцава М.А.

2. На абласны этап V Рэспубліканскага фестывалю-конкурсу праектаў “Нашчадкі традыцый” былі накіраваны конкурсныя матэрыялы навучэнцаў устаноў адукацыі “Глінская сярэдняя школа”, “Бягомльская сярэдняя школа імя С.С.Манковіча”, ДУДА “Докшыцкі раённы цэнтр дзяцей і моладзі”.

Зам. дырэктара А.У.Вайцяховіч

Савулава 59791